УДК 745.522.1(474.3)«20»

# Сучасны тэкстыль Латвіі: у прасторы традыцый і эксперыментаў

**Круміня Іева*, Цыбульскі М. Л.****
**Латвійская акадэмія мастацтва, Рыга*
***Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», Віцебск*




*Мінулы год стаў асабліва плённым для аматараў мастацтва тэкстылю. Тры буйныя выставы-праекты, якія прадставілі беларускаму гледачу творчасць латвійскіх майстроў тэкстылю ў 2015 годзе, практычна вызначылі пэўны спектр традыцый і шляхі яго эксперыментальнага развіцця. Наўрад ці магчыма на падставе некалькіх выстаў казаць пра глабальныя тэндэнцыі развіцця тэкстыльнага мастацтва ў краіне, але абазначыць дыяпазон асноўных вектараў яго развіцця на сучасным этапе цалкам верагодна. У артыкуле даследуюцца асноўныя асаблівасці сучаснага мастацкага тэкстылю Латвіі, вызначаюцца актуальныя праблемы і тэндэнцыі ў яго развіцці на падставе мастацкіх праектаў, прадстаўленых на Беларусі. Асаблівая ўвага надаецца аналізу стылістыкі, мастацкіх прыёмаў увасаблення творчых ідэй з выкарыстаннем розных відаў, тэкстыльных тэхнік і матэрыялаў. Аўтары прасочваюць ролю Латвійскай акадэміі мастацтваў і Асацыяцыі мастакоў тэкстылю ў развіцці самабытнай тэкстыльнай школы.*

***Ключавыя словы:** мастацкі тэкстыль, аўтарскі тэкстыль, габелен, традыцыя, эксперымент, сучаснае мастацтва Латвіі.*

(Искусство и культура. — 2016. — № 2(22). — С. 25-32)

# Contemporary Textile of Latvia: in the Space of Tradition and Experiment

**Kruminya Yeva*, Tsybulski M. L.****
**Latvian Academy of Art, Riga*
***Educational Establishment «Vitebsk State P. M. Masherov University», Vitebsk*

*Last year was very abundant for textile art amateurs. Three big exhibition projects, which presented creative work by Latvian textile artists in 2015 to Belarusian audience, practically singled out the specter of traditions and ways of its experimental development. It's hardly possible, on the basis of several exhibitions, to speak about global development tendencies of textile art in the country, at the same time, it's possible to outline the range of main vectors of its development at the modern stage.*

*Main features of contemporary art textile of Latvia are studied in the article, current issues and tendencies of its development on the basis of art projects presented in Belarus, are identified. Special attention is drawn to the analysis of stylistics, artistic ways of implementation of artistic ideas with the application of different types, textile techniques and materials. The authors trace the role of Latvian Academy of Arts and Textile Artist Associations in the development of the national textile school.*

***Key words:** art textile, author's textile, tapestry, tradition, experiment, contemporary art of Latvia.*

(Art and Culture. — 2016 — № 2(22). — P. 25-32)

Нягледзячы на тое, што тэкстыль з'яўляецца адным з найстаражытнейшых відаў мастацтва ў гісторыі чалавецтва, тым не менш, нярэдка яго лічаць прыкладной сферай дзейнасці, якая знаходзіцца на перыферыі мастацкага працэсу і, усяго толькі, выконвае побытавыя функцыі. Нават у XXI стагоддзі працягваюць гучаць словы аб праве на існаванне тых ці іншых формаў тэкстылю, аб неабходнасці разглядаць шляхі яго развіцця ў кантэксце архітэктуры і г. д. [1]. Разам з тым ужо другая палова XX і пачатак XXI стагоддзя выразна прадэманстравалі

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* mtsybulsky@rambler.ru – **М. Л. Цыбульскі**

Репозиторий ВГУ

эксперыментальныя магчымасці тэкстылю ў формаўтваральных працэсах.

Мэта дадзенага артыкула – вызначыць асноўныя тэндэнцыі ў развіцці сучаснага тэкстылю Латвіі на падставе аналізу трох буйных выставачных праектаў, якія былі прадстаўлены на Беларусі.

Шэраг мастацкіх праектаў сучаснага тэкстылю Латвіі, якія прайшлі ў розных гарадах Беларусі (Віцебск, Мінск, Орша) ў 2015 годзе, ці не ўпершыню за апошнія некалькі дзесяцігоддзяў, прадставілі магчымасць беларускім гледачам пазнаёміцца з сучасным станам латвійскага тэкстыльнага мастацтва. У экспазіцыях выстаў быў прадстаўлены шырокі дыяпазон тэхнік і тэхналогій, тэм і стыляў, у якіх сёння працуюць мастакі тэкстылю Латвіі, пачынаючы з кампазіцый, створаных падчас навучання, твораў маладых мастакоў, да тэкстыльных кампазіцый майстроў сярэдняга і старэйшага пакалення.

Ужо першае знаёмства з экспазіцыяй "Сучасны тэкстыль Латвіі", якая працавала ў сакавіку 2015 года ў Віцебскім мастацкім музеі, уражвала свабодай інтэрпрэтацый і шматграннасцю асацыяцый, шматколернасцю і музычнасцю пластычных рытмаў, высокай культурай выкарыстання матэрыялу і тэхнічным майстэрствам, а яшчэ відавочнай прысутнасцю нацыянальных традыцый, хоць часцей за ўсё радыкальна трансфарміраваных. На выставе было прадстаўлена больш за паўсотні кампазіцый. У асноўным гэта творы, якія былі выкананыя за апошнія некалькі год. Куратары праекта (І. Круменя і М. Цыбульскі) імкнуліся прадставіць беларускаму гледачу як традыцыйныя, так і эксперыментальныя працы, так званы арт-тэкстыль. Сапраўды, традыцыі застаюцца ўніверсальнымі фундаментальнымі рысамі, бачная ці прыхаваная сувязь з якімі вызначае адзінства і цэласнасць латышскай школы тэкстылю, незалежна ад шматграннасці прадстаўленых у ёй аўтарскіх накірункаў. Выдатны густ, які нязменна суправаджае творы латышскіх мастакоў тэкстылю – гэта тое асноўнае, што, на наш погляд, і ёсць частка традыцый выдатнай школы. Традыцый, у моцным гравітацыйным полі якіх і адбываюцца ў Латвіі эксперыменты і ўнутрымастацкія мутацыі сучаснага мастацтва тэкстылю.

У нашы дні тэкстыль у Латвіі, як і іншыя галіны мастацтва, не абмежаваныя ніякімі вызначанымі тэмамі, умовамі і нават вядомымі магчымасцямі тэхнік, засвойвае шырокія, у тым ліку міждысцыплінарныя прасторы, дакранаецца да незвычайных тэм, выкарыстоўвае любыя матэрыялы і вялікі спектр разнастайных аўтарскіх тэхнік, якія здольныя адлюстраваць асноўную ідэю мастацкага твора. А разважанні мастакоў, якія запрашаюць гледача да дыялогу, датычацца самых разнастайных пытанняў – прыроды, грамадства, індывідума, палітыкі, праблем чалавечых стасункаў – інакш кажучы пытанняў пра жыццё і час, у якім мы жывём.

Мастацтва тэкстылю ў Латвіі прафесійна вывучаюць больш за паўстагоддзя. Значнай падзеяй у станаўленні школы латышскага тэкстылю стала стварэнне кафедры мастацкага афармлення тэкстылю ў Рыжскай акадэміі мастацтваў у 1961 годзе. Яе ўзначаліў Рудольф Хеймратс, якога сёння многія лічаць заснавальнікам школы латышскага габелена і сваім настаўнікам у тэкстылі. У 1994 годзе Ая Бауманэ змяніла Р. Хеймратса на пасадзе загадчыка кафедры Акадэміі і стала на чале новастворанай Асацыяцыі латвійскіх мастакоў тэкстылю. За гэты час вырасла некалькі пакаленняў мастакоў, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё гэтага віду мастацтва, пашырылі кола стылістычных накірункаў у развіцці тэкстылю, значна ўзбагацілі дыяпазон выкарыстоўваемых тэхнік і тэхналогій. Кафедра тэкстылю Латвійскай акадэміі мастацтваў за некалькі дзесяцігоддзяў свайго існаванняператварылася ў асяродак, дзе пачынаючыя мастакі не толькі засвойваюць асновы рамяства, даведваюцца пра разнастайныя матэрыялы, фарбы і тэхнікі, але і набываюць першапачатковы творчы вопыт. Каб потым праз індывідуальныя пошукі структур, формаў і матэрыялаў знайсці сваю арыгінальную манеру. Сярод латвійскіх мастакоў тэкстылю нямала, яркіх, творчых індывідуальнасцяў. У кожнага з іх свая мова, свае сродкі мастацкага самавыяўлення, свае падыходы, свая рытмічная інтанацыя, свае непаўторныя сродкі выражэння.

Рэпазіторый ВДУ

**Асацыяцыя тэкстылю Латвіі.** Значная частка творчага жыцця для мастака – рэгулярны ўдзел у рэгіянальных і міжнародных выставах. Каб аб’яднаць мастакоў розных пакаленняў, якія працуюць у тэкстылі, натхніць іх на рэгулярны ўдзел у выставах, паспрыяць абмену прафесійнай інфармацыяй, у 1994 годзе была створана Асацыяцыя тэкстыльнага мастацтва Латвіі. Гэтай арганізацыяй з моманту яе стварэння кіруе вядомая мастачка, прафесар Акадэміі мастацтваў Латвіі Ая Бауманэ.

Дваццаць гадоў існавання Асацыяцыі напоўнены незлічонай колькасцю выстаў, творчымі пошукамі, бурнымі дыскусіямі, блізкімі і далёкімі вандраваннямі, агульнымі стараннямі і адзінотай у цішы майстэрні. У 1995 годзе пры змене дзяржаўнай структуры значныя змены закранулі і мастакоў, якім давялося шукаць іншыя формы існавання і дзейнасці. У аснове дзейнасці Асацыяцыі тэкстыльнага мастацтва ляжаць дэмакратычныя прынцыпы. У гэтай арганізацыі аб’яднаны прафесійныя мастакі ўсіх пакаленняў і студэнты, якія вывучаюць мастацтва, з мэтай правядзення выстаў, абмену інфармацыяй, падтрымання творчага асяроддзя і таго пачуцця локця, якое хоць бы часам неабходна любому. Адзін з найважнейшых прынцыпаў дзейнасці асацыяцыі – правядзенне штогадовых выстаў, якія даюць магчымасць паказаць публіцы новыя працы, а самім мастакам – сустрэцца, ацаніць здзяйсненні калег, убачыць свае працы ў агульным кантэксце. Але дэмакратыя не павінна перамагчы прафесіяналізм, і таму ў кожнай з выстаў ёсць журы, у якое ўваходзяць паважаныя ўсімі мастакі-тэкстыльшчыкі разам з запрошанымі мастацтвазнаўцамі і мастакамі з іншых галін творчасці.

Дзякуючы высокай выставачнай актыўнасці Асацыяцыі, тэкстыль Латвіі сёння добра вядомы ў Еўропе і ў свеце. У супрацоўніцтве з Пасольствамі Латвіі за мяжой намі былі арганізаваны выставы ў Чэхіі, Эстоніі, Германіі, Нарвегіі, Італіі, Грэцыі, Бельгіі, Кітаі, Расіі, Беларусі, Азербайджане, Польшчы, Турцыі, Іспаніі.

Каб рэгулярна атрымліваць інфармацыю пра актуальныя падзеі ў свеце, Асацыяцыя тэкстылю Латвіі ўваходзіць у склад міжнародных арганізацый – European Textile Network (ETN) і American Tapestry Alliance (ATA).

**Праект “Вібрацыі матэрыялу”. Эксперыментальны тэкстыль Латвіі.** Латвійская асацыяцыя тэкстыльнага мастацтва выставай “Вібрацыі матэрыялу” ў Віцебскім мастацкім музеі ў верасні 2015 года адзначыла сваё 20-годдзе ўжо на беларускай зямлі. У аснове гэтай выставы – працы, створаныя мастакамі да юбілейнай выставы Асацыяцыі, якая адбылася ў выставачнай зале Саюза мастакоў у Рызе за год да віцебскай. Прастору экспазіцыі на віцебскай выставе трымалі тэкстыльныя аб’екты і аб’ёмны тэкстыль. Галоўным лейтматывам праекта стала акцэнтуацыя эксперыментальных накірункаў, тэхнік і тэхналогій у развіцці сучаснага тэкстылю Латвіі.

Назва “Вібрацыі матэрыялу” адлюстроўвала шырокі спектр тэхнік і тэхналогій, прадстаўленых у творах мастакоў тэкстылю. А да таго ж накіроўвала гледачоў на спасціжэнне розных вобразных канцэпцый, мадыфікацый творчай інтэрпрэтацыі тэкстыльных і нетэкстыльных матэрыялаў. У прадстаўленых у экспазіцыі творах прадстаўнікі розных пакаленняў – ад першых выпускнікоў аддзялення мастацтва тэкстылю Латвійскай акадэміі мастацтва да студэнтаў малодшых курсаў – знаёмілі віцяблян з найбольш актуальнымі ідэямі, рэпрэзентавалі сваё бачанне свету праз тэкстыльныя вобразы. Відавочна, што тэкстыль, як і мова, характарызуе нацыю, выяўляе яе каштоўнасці, досвед і светаадчуванне.

**Аўтарская тапісерыя: традыцыі і эксперыменты.** Адметнай асаблівасцю культурнай сітуацыі ХХ стагоддзя ў цэлым стала актыўнае развіццё аўтарскай тапісерыі. Пры гэтым паняцце аўтарскай у першую чаргу датычылася тэхнічнага боку выканання і вызначалася ўжываннем не столькі вынайдзенай мастаком, арыгінальнай тэхнікі, колькі змешваннем тэхнік у працы над тэкстыльнымі кампазіцыямі.

Тэрмін “аўтарская тапісерыя” больш дакладна адлюстроўвае рэальнае становішча рэчаў і ў сучасным тэкстылі Латвіі, а да таго ж уключае творы, якія выкананы не толькі рознымі прыёмамі дыванаткацтва, але і з

Репозиторий ВГУ

дапамогай іншых тэхнік (вязання, пляцення, вышыўкі, аплікацыі, разнастайных аўтарскіх тэхнік і г. д.). Пры гэтым тэкстыль захоўвае ўласцівую яму першародную семантыку, якая грунтуецца на мяккасці і цеплыні выкарыстоўваемага матэрыяла. Вобразна-тэматычны дыяпазон прадстаўленых на выставе твораў даволі шырокі: ад візуальнай фіксацыі аб'ектаў навакольнага свету, разнастайных інтэрпрэтацый, гульняў і рэмінісцэнцый да філасофскіх разважанняў. Працы мастакоў адрозніваюць метафарычнасць, цікавасць да архетыпаў, аўтарскай міфалогіі.

У наш час у тэкстылі Латвіі, які гістарычна славіўся тонкай, скрупулёзнай ручной працай, побач з традыцыйнымі тэхнікамі і тэхналогіямі прысутнічаюць і новыя – звязаныя з магчымасцямі сучасных ткацкіх станкоў і швейных машын з камп'ютарным абсталяваннем. Хоць, па сутнасці, ніводная тэхніка і тэхналогія не заменяць бясконцага шляху пошукаў таленавітага мастака, творчага працэсу, сведкамі якога становяцца гледачы. Выкарыстанне камп'ютарнай тэхнікі, лічбавых тэхналогій, як і выкананне тэкстылю на жакардавых машынах, становіцца звыклым у латышскім мастацтве, дзякуючы магчымасці хутка рэалізаваць свае ідэі ў матэрыяле. Пра гэта сведчаць і прадстаўленыя на выставе творы, якія выкананы ў тэхніцы традыцыйнага жакарду (Дзіяна Янушонэ (“Аніма+Анімус”)), так і кампазіцыі з выкарыстаннем дыгітальнага друку (творы Ліліты Баугэ (“Адкрыццё”), Сабіны Вікснэ (“Чорна-белы оп-арт”), Анцэ Маркоўска (“Чаканне”), Байбы Осітэ (“Глабальнае мысленне, лакальны працэс”)). У стылістыцы сучаснага тэкстылю відавочная цікавасць і да дыялогу з іншымі відамі мастацтва, графікай, дызайнам, кінематографам і фатаграфіяй.

Сярод апошніх тэндэнцый у развіцці латышскага тэкстылю – цікавасць мастакоў да тых галін, якія раней лічыліся праявай самадзейнай творчасці, дамаводствам (вышыўка, макрамэ, лапікавая тэхніка (пэчварк), і інш.) ці адносіліся да традыцыйных рамёстваў (напрыклад, лямец). Тэкстыльшчыкі Латвіі звяртаюцца да традыцыйных рамёстваў, да тэкстыльнай творчасці. Гэта тэндэнцыя відавочна ў творах Ірэны Андрэевай (“Мандала”, “Аўтапартрэт”), Марэ Віюпэ (“Залатыя дакрананні”) з выкарыстаннем вышыўкі. Ці ў кампазіцыях, дзе ўжываецца лапікавая тэхніка (Інэса Якабі (“Cisu maiss”)), вязанне (творы Аі Баўмане (“Восеньская павуцінка”), Барбары Абеле (“Нязношаная рэч”), Дайны Дагніі (“Тры каралі”), Скайдрытэ Лейманэ (“Аўтапартрэт”, “Іева з пірсінгам”).

Асаблівую папулярнасць у творчасці латвійскіх мастакоў тэкстылю набыў лямец (творы Руты Богуставай (серыя твораў “Тры колеры”), Анды Скадманэ (“Аўтапартрэт”), Маі Пунцуле (“Ессе”)).

Актуальнай для сучаснага латышскага тэкстылю застаецца і стылістыка народнага мастацтва, зварот да асаблівасцей арнаментальна-кампазіцыйнага рашэння плоскасці тэкстыльнага палатна. Дастаткова прыгадаць прадстаўленыя на выставе творы Руты Богуставай, Дайны Дагніі, Ілзэ Гаіланэ, Зане Лусе.

Прыярытэт, які мастакі Латвіі аддаюць эксперыменту, здаецца, заўжды быў адным з найбольш значных фактараў, які надаваў асаблівую каштоўнасць іх творчасці. У сваю чаргу ўжо апошняя чвэрць мінулага стагоддзя абазначыла сур'ёзныя змены ў развіцці мастацкага тэкстылю, які пачаў актыўна аддаляцца ад традыцыйных уяўленняў аб ім. Мастакі ўсё часцей у аўтарскім тэкстылі выяўляць сваю творчую індывідуальнасць. Тэкстыль канчаткова стаў нефункцыянальным мастацкім аб'ектам, які ад пачатку да канца выканана творцай. Сёння ў тэкстылі Латвіі традыцыйныя тэхнікі і тэхналогіі саступілі месца змяшаным, пазбаўленым якіх бы то ні было абмежаванняў. У тэкстыльных кампазіцыях адчуваецца адмаўленне ад спрошчанай выяўленчасці і імкненне да дэкаратыўнасці і падкрэслена філасофскіх тэм.

Калі знаёмішся з эксперыментальным тэкстылем латышскіх мастакоў, адзначаеш яго стылістычную блізкасць з іншымі відамі мастацтваў: скульптурай, керамікай, дэкаратыўнай пластыкай. Сучасны тэкстыль Латвіі відавочна развіваецца на мяжы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і сучаснага тэкстыльнага дызайну. Даволі шырокай выглядае і палітра мастацкіх сродкаў, якія спрыяюць пошуку арыгінальных пластычных рашэнняў. Мастакі тэкстылю займаюцца вынаходніцтвам аўтарскіх тэхнік, пры гэтым актыўна выкарыстоўваць напрацаванае прадстаўнікамі навейшых

Рэпазіторый ВДУ

плыняў. Арыгінальнасць і пластычная выразнасць вылучаюць работы, якія выкананыя ў аўтарскіх тэхніках (творы Роландса Крутаўса (“Сады энергіі”), Ірысы Блуматэ (“Камень млына”), Інгі Брыніня (“Лясныя пісанні”), Эліны Генітэ (“Воблака”), Марытэ Лейманэ (“Аднадзёнка”), Даце Пуга (“Сняжынкі”), Ілзэ Гаіланэ (“Чатыры”)).

У тэкстылі, які набыў падкрэслена канцэптуальны характар, акрамя воўны, шоўку, лёну і бавоўны, мастакі сёння эксперыментуюць з паліэстрам, віскозай, палоскамі тканіны, скурай, трыкатажам, тасьмай і г. д. Нярэдка для стварэння тэкстыльных аб’ектаў выкарыстоўваюцца далёка не тэкстыльныя матэрыялы, якія ствараюць нечаканыя эфекты і пашыраюць магчымасці пошуку незвычайных мастацкіх вобразаў. Ткацтва з ужываннем паперы выкарыстоўвае Зане Лусе (“Шлях сонца”), Яніс Тропс (“Цені”) а з выкарыстаннем металічнага дроту – Раса Грамаціня (“Шэрабелы”), Інгрыда Суна (“Кветка ветра”).

У экспазіцыі гэтай выставы ёсць творы, у якіх ткацтва ўдала спалучаецца з аплікацыяй ці калажом (творы Ілоны Лінартэ, Даце Пуданэ, Байбы Шаурыня, Мадары Яночкі), размалёўкай ці фотадрукам, вышыўкай, макрамэ, іншымі відамі пляцення. Батык у розных інтэрпрэтацыях выкарыстаны ў творах Анда Скадмане («Аксаміцісты камень»), Крысціне Сіле (“Прыходзьце да мяне сёння ўвечар на кубак чаю”). Для дэкарыроўкі фактуры паверхні мастакі ўжываюць элементы тэрмадруку, камп’ютарнага друку. Тэхніка шаўкаграфіі ляжыць у аснове тэкстыльных кампазіцый Сняжаны Веліка (“Праграма Google Планета Зямля”), Сабіне Віксне (“Пераменны ток”), Руты Богуставай “Новыя боты”.

Цікавыя ўзоры аб’ёмнага тэкстылю і тэкстыльныя аб’екты прадставілі Дзіяна Янушонэ (“Крохкая магутнасць”), Мая Зачэстэ (“Вулкан”), Таццяна Александара (“Замкнёныя I, II”), Эліна Гібіетэ (“Мутанты”), Ілзэ Гаіланэ (“Бурбалкі”), Ганна Сканэ (“Жанчына-накаўт, ці Жалезная лэдзі”).

Назіранні на латвійскіх і замежных выставах прыводзяць да высновы, што матэрыял і тэхніка могуць стаць і перавагай, і каменем перапоны для мастацтва тэкстылю: калі мастак, які паддаваўся зачараванню кветак, фактур і формаў, забывае пра ідэю, то вынік нярэдка набліжаецца да рамеснага вырабу. Але і сур’ёзнай, разумнай ідэі патрабуецца адэкватнае, прафесійнае і віртуознае выкананне, інакш твор становіцца плоскім і сумным. Гэта і ёсць адна з галоўных задач – працаваць, паважаючы патэнцыйнага, але незнаёмага гледача, паколькі дыялог напроста адбудзецца паміж творам мастацтва і наведвальнікам выставы, а сам мастак пры гэтым часта застаецца за кадрам.

Мастацтва тэкстылю і ў Латвіі, і за мяжой паступова становіцца міждысцыплінарным, бо класічныя тэхнікі (габелен, батык, вышыўка, качанне з воўны і інш.) нярэдка спалучаюцца з іншымі выкарыстоўваемымі прыёмамі выканання, перакрываецца зусім нетрадыцыйнымі спосабамі, з інтэграваннем зусім новых матэрыялаў. Мастакі іншых галін, напрыклад, жывапісцы і скульптары, таксама часта выкарыстоўваюць валакністыя матэрыялы пры стварэнні сваіх прац. Гэта інтэграцыя ўзбагачае, бо расшырае дыяпазон поглядаў, абуджае нечаканыя асацыяцыі, удасканальвае наш вопыт і практыкуе эмацыйныя амплітуды. Тэкстыль займае ўсе новыя і новыя мастацкія, дызайнерскія і міжгаліновыя тэрыторыі, набываючы іншыя значэнні і функцыі, становячыся адным з самых ёмістых відаў візуальнага мастацтва.

У кожнага чалавека незалежна ад адукацыі, нацыянальнасці і ўзросту маюцца свае адносіны з тэкстылем – на ўзроўні тактыльных адчуванняў мы знаёмыя з валокнамі розных структур ужо з нараджэння, тэкстыль з’яўляецца формай матэрыі, якая найбольш багата асабістымі асацыяцыямі, магчыма, таму і мастацтва тэкстылю ўтрымлівае высокую папулярнасць у грамадстве.

**Міні-тэкстыль.** У межах аднаго мастацкага праекта разам з эксперыментальным тэкстылем на Беларусі была прадстаўлена і даволі вялікая па аб’ёме калекцыя латвійскага міні-тэкстылю пад назвай «Канцэнтраваныя думкі». Дадзеная калекцыя мініяцюрных прац ствралася на працягу шэрагу гадоў, шматлікія з твораў, якія ўвайшлі ў яе склад, пабывалі на розных міжнародных выставах, дзе атрымалі ўзнагароды. Тэматыка твораў вельмі шырокая – ад адлюстравання асабістых адчуванняў і настрояў, малюнкаў прыродных аб’ектаў і з’яў, выражэння парадоксаў да сур’ёзных гістарычных, экалагічных і

Рэпазіторый ВДПУ

сацыяльных тэм. Беларускія гледачы змаглі ўбачыць і параўнаць розныя творчыя манеры аўтараў у розных фарматах, калі наведвалі адначасова і выставу эксперыментальнага нетрадыцыйнага тэкстылю латвійскіх мастакоў.

Агульнавядома, што мініяцюрны тэкстыль у Еўропе і ЗША як асобны жанр перажыў свой росквіт у 1960–1970-я гады, калі, пры перавазе ў мастацтве тэкстылю манументальных формаў і наватарскіх тэхнік, мастакоў перад буйнымі выставамі прасілі ствараць мадэлі прац у мініяцюрным фармаце. Гэтыя мадэлі апынуліся настолькі прафесійнымі, самадастатковымі і цікавымі, што адразу ж сталі экспанатамі асобных выстаў, а найбольш выразныя з іх трапілі ў кнігі, каталогі і музейныя калекцыі, выклікаўшы ў грамадстве вялікую цікавасць і абудзіўшы ў мастакоў азарт да ўдзелу ў спецыялізаваных выставах. На абшарах былога СССР міні-тэкстыль пачаў актыўна развівацца ўжо ў сярэдзіне 70-х гадоў у процівагу тагачаснаму засіллю буйных форм і развіццю манументальнага тэкстылю. Першая выстава еўрапейскага міні-тэкстылю была паказана яшчэ ў 1974 годзе ў Лондане. А ў наступным годзе на біенале ў Лазане быў шырока прадстаўлены японскі міні-тэкстыль, які на працягу многіх гадоў трывала ўтрымліваў лідарскія пазіцыі. З таго часу тэкстыльная мініяцюра пачала ўспрымацца мастакамі розных краін, як адмысловы від эксперыменту ў сучаснай мастацкай творчасці.

Міжнародныя выставы мініяцюрнага тэкстылю сёння рэгулярна праходзяць у Італіі, Венгрыі, Польшчы, Літве, Славакіі, Францыі, на Украіне і г. д. Назвы гэтых біенале і трыенале добра ведаюць мастакі па тэкстылі ва ўсім свеце і рэгулярна ў іх удзельнічаюць. Мініяцюрны фармат патрабуе сканцэнтраванай думкі, выразнай формы выражэння, дакладнага выбару матэрыялу і адэкватнага тэхнічнага рашэння. Вядома, нярэдка бывае і так, што праца ў жанры мініяцюрнага тэкстылю ўзнікае як эксперымент, гульня з матэрыялам ці новастворанай тэхнікай. Такім чынам пашыраюцца магчымасці самавыяўлення мастака, нараджаюцца новыя ідэі і імпульсы для новых, часта куды больш манументальных прац. Запрашэнні да ўдзелу ў інтэрнацыянальных выставах падтрымліваюць мастакоў у добрай творчай форме і даюць ім магчымасць убачыць свае працы ў міжнародным кантэксце.

У Латвіі ці не самай папулярнай разнавіднасцю міні-тэкстылю доўгія часы быў міні-габелен. Менавіта ён стаў добрай глебай для эксперыментаў і засваення новых тэхнік і тэхналогій. Перыяд постмадэрнізму не толькі ўмацаваў пазіцыі гэтага віду творчасці, але надаў яму новыя вектары развіцця, скіраваўшы ўвагу мастакоў на засваенне спадчыны цэлага шэрагу культурных пластоў, ужыванне шырокага дыяпазону матэрыялаў. Пра гэта сведчаць і творы, якія былі прадстаўлены на выставах у Беларусі. Разнастайныя інтэрпрэтацыі ткацкіх тэхнік прапануюць у сваіх міні-габеленах Яна Пурмале (“Сны”, “Барацьба за жыццё”), Марытэ Лейманэ (“Плынь”), Ілзэ Сілдарэ (“Гісторыі кветак”), Агнэсэ Туканэ (“Усё плавіцца і ўсё змяняецца”), Інгрыда Суна (“Павеў Заходняй Дзвіны”), Ірэна Андрэева (“Тры эскізы”), Алена Екабсонэ (“Эскізы”). Спалучэнне тэхнік і разам з тым арыентацыя на форму традыцыйнага міні-габелену характарызуе міні-кампазіцыі Аі Баўманэ («Пачуццё зімы»; “Рытмы Даўгавы”; “Зорачка”; “Анёлы захавальнікі”; “Рух”; “Палёт”).

Як вядома, мініяцюрныя тэкстыльныя кампазіцыі як плоскія, так і аб’ёмныя, не адразу атрымалі статус твора мастацтва. Доўгі час многае з таго, што сёння мы бачылі на выставах латвійскага тэкстылю і прафесіяналамі вызначаецца як творчая прастора міні-тэкстылю, лічылася звычайным дамаводствам, хатняй творчасцю ці простым захапленнем. Менш чым за пяцьдзясят гадоў міні-тэкстыль прайшоў шлях ад простага творчага эцюда і форэскіза, да самастойнага і адметнага накірунку ў развіцці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Міні-тэкстыль не згубіўся ў актуальнай прасторы мастацтва, а малы фармат і камернасць перасталі быць прыкметай нейкай непаўнавартаснасці твора мастацтва. Відавочна, падкрэслены аўтэнтычны характар міні-тэкстылю ўсё часцей прыцягвае да сябе ўвагу аналітыкаў і дае падставу разважаць пра яго асаблівую папулярнасць.

Сапраўды час накладае свой адбітак і на тэхнічны бок мастацкіх твораў і таму выкарыстанне, напрыклад, дыгітальнага друку ў міні-тэкстылі стала натуральным і глядзіцца вельмі арганічна (творы



Рэпазіторый ВДУ

Іевы Круміня “Трансфарматар”, “Віхур”, “Бясконцая гісторыя” і Дзіяны Дзімза Дзіме “Смейцеся, каб душа не плакала!”). Такім чынам, у сучасных умовах аўтарскі міні-тэкстыль атрымаў новае гучанне.

Відавочна і тое, што ў наш час у творчасці мастакоў Латвіі, якія працуюць з міні-тэкстылем імкненне самавыяўлення і аўтарская задума зусім не перашкаджаюць дамінаванню этнічнай традыцыі. І гэта зразумела: народная творчасць заўсёды служыла і працягвае служыць невычэрпнай крыніцай для творчасці многіх мастакоў. Этнічны характар арнаментыкі тэкстылю і яго каларыстычнага рашэння прасочваецца ў мінімалістычна дакладных творах Яніса Банковічса “Песня трох народаў Даўгаве”. Асабліва актыўна выкарыстоўваецца латвійскімі мастакамі вышыўка ў розных варыяцыях, спалучэннях і на розных матэрыялах: на бярозавай кары (Інэсе Якобі “Прывітанне”), на лямцу (Іева Круміня “Пыл з космасу”). Кажучы пра выкарыстанне тэхнікі вышыўкі ў міні-тэкстылі прыгадаем таксама творы Ліенэ Ратнікс “Жменька золата”; Гунты Стыерэ «Лічыльнік зорак»; Іевы Круміня «Высушанае месяцовае святло»; Ірэны Андрэевай “Лісты з Афганістана”; Ілзэ Гайлане “Хутка-павольна”; Агнэсы Кірмужа “Яна” і “Аўтапартрэт”; Байбы Осітэ “Лета I, II”, Ілзэ Бітэ “Аўтапартрэты” (6 шт.); Дзіяны Дзімза Дзіме “Смейцеся, каб душа не плакала!”; Юліі Бандарэнка “Аўтапартрэты” (9 шт.)).

Па нейкай аналогіі з асабліва папулярным і запатрабаваным у сучаснай мастацкай практыцы мастацтвам аб’екта ў галіне мініяцюрных форм тэкстылю таксама з’явіўся тэкстыльны аб’ект. Неардынарнасцю творчых падыходаў да вырашэння мастацкага вобраза вылучаюцца тэкстыльныя аб’екты Ірысы Блуматэ («Вугаль»), Ліввы Капрале («3D-Лавец сноў»), Іевы Круміня (“Паломніцтва”), Руты Богуставай (“У садзе”, “Лета”; “Вясна”), Эдытэ Паулс-Вігнэрэ (“Капялюш жартаўніка” і “Марскія губкі I, II, III”), Скайдрытэ Леймане (“Дзьмухавец” і “Першы год”), Інэсы Якобі (“Труба I, II, III”), Крысцінэ Сіле (“Навучанне ў літасць”), Дзіны Бауманэ (“Узоры Даўгавы – эка прадукт”).

Пошукі ўласнай мастацкай мовы, як і эксперыменты з тэхнікамі і тэхналогіямі, застаюцца актуальнымі для мастакоў тэкстылю Латвіі. Аўтарская тэхніка па-ранейшаму асабліва прыцягвае мастакоў (кампазіцыі Петэрыса Сідарса “Лядовая Цытадэль”, цэлюлоза), Лівы Капрале “Кропля”, Іевы Круміня “Я ведаю, што я нічога не ведаю”; ”Самародак”). Зварот да змяшанай тэхнікі ўласцівы творчасці Марытэ Леймане “Аблокі над Даугавай”, “Даугмале”, “Берагі Даугавы”), Айны Музэ (“Я Адзіны”, “Комплекс Гольджы”), Ролантса Крутаўса (“Час пазычана ад Бога”), Руты Богустовай (“Зіма пастукала”, “Зялёная кветка”, “Яйка цмока”). Часам назва “тэкстыльны аб’ект” у дачыненні да твора, у якім дамінуюць зусім не тэкстыльныя матэрыялы, здаецца дастаткова ўмоўнай (творы Уніты Нагла “Ахілесава пята”, метал; Ірысы Блуматэ “Залатая рыбка” метал, лён) і разам з тым выразна падкрэслівае сучасныя тэндэнцыі ў развіцці міні-тэкстылю.

Двухмерныя і трохмерныя аб’екты ўдзельнікаў гэтай выставы, улюбёных у тэкстыль, уражваюць крэатыўнасцю вобразна-пластычных рашэнняў, канцэптуальным ці філасофскім падтэкстам, а часам і проста гульнявым падыходам да інтэрпрэтацыі вобраза, і канешне ж выразнай эмацыянальнасцю і пачуццёвасцю.

Мініяцюра як асобнае заданне сёння ўваходзіць ў навучальную праграму Акадэміі мастацтва па спецыяльнасці “Мастацтва тэкстылю” і дапамагае студэнтам пераканацца ў правільным выбары тэмы, стварэнні формы і шліфоўцы тэхнікі. У літаратуры кароткі аповяд ці верш у сціснутай форме можа даць чытачу гэтульki ж эмоцый, колькі доўгая паэма, ці раман. У нейкай ступені можна параўнаць творы літаратурных жанраў з таленавітымі мініяцюрамі ў мастацтве, якія па шчыльнасці формы і думак не менш каштоўныя, чым творы мастацтва вялікага фармату.

Адзін з імпульсаў для стварэння твора мастацтва – гэта радасць, а мініяцюрны тэкстыль нярэдка яе матэрыялізуе ў дакладнай форме. Мініяцюра можа дзейнічаць як вітамін, натхняючы гледача на творчасць.

Пасля Віцебска выстава эксперыментальнага тэкстылю Латвіі напрыканцы кастрычніка мінулага года была разгорнута ў Аршанскай галерэі В. Грамыкі ў межах азнаямленчага візіту Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Латвійскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Марціньша Вірсіса і

Репозиторий ВГУ

кіраўніка Консульства Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску Угіса Скуя ў г. Оршы. А 1 снежня выставы твораў латвійскага тэкстылю «Вібрацыі матэрыялу» і «Канцэнтраваныя думкі» адкрыліся адразу на ўсіх экспазіцыйных плошчах былога Музея сучаснага мастацтва ў Мінску (зараз Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў). Для латвійскіх мастакоў тэкстылю, сяброў Латвійскай асацыяцыі тэкстылю гэта была адна з буйнейшых прэзентацый сваёй творчасці ў Беларусі за апошнія дваццаць гадоў.

Усе тэкстыльныя праекты на Беларусі былі арганізаваны дзякуючы супрацоўніцтву паміж мастацка-графічным факультэтам Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава і Латвійскай акадэміяй мастацтваў і рэалізаваны пры дапамозе Консульства Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску і падтрымцы Пасольства Латвійскай Рэспублікі ў Беларусі.

**Заключэнне.** Абапіраючыся на прааналізаваныя вышэй выставы латвійскага тэкстылю, што адбыліся на Беларусі і ўлічваючы актыўную практыку экспазіцыйнай дзейнасці тэкстыльшчыкаў Латвіі па ўсім свеце, можна ўпэўнена сцвярджаць, што сёння латвійскі тэкстыль яскрава адлюстроўвае актуальныя тэндэнцыі ў развіцці гэтага віду мастацтва. Значную ролю ў гэтым адыгрываюць кафедра тэкстылю Латвійскай акадэміі мастацтва і Асацыяцыя тэкстылю Латвіі.

Сучасны латвійскі тэкстыль вылучаецца свабодай інтэрпрэтацый і, разам з тым, прысутнасцю нацыянальных традыцый, шматграннасцю пластычных рытмаў, высокай культурай выкарыстання матэрыялу і тэхнічным майстэрствам. Мастакі дакранаюцца да самых незвычай-ных тэм, выкарыстоўваюць любыя матэрыялы і вялікі спектр разнастайных аўтарскіх тэхнік. Тэрмін “аўтарская тапісерыя” больш дакладна адлюстроўвае рэальнае становішча рэчаў у сучасным тэкстылі Латвіі, а да таго ж уключае творы, якія выкананы не толькі рознымі прыёмамі дыванаткацтва, але і з дапамогай іншых тэхнік (вязання, пляцення, вышыўкі, аплікацыі, разнастайных аўтарскіх тэхнік і г. д.) Пры гэтым тэкстыль захоўвае ўласцівую яму першародную семантыку, якая грунтуецца на мяккасці і цеплыні выкарыстоўваемага матэрыялу. У наш час у тэкстылі Латвіі побач з традыцыйнымі тэхнікамі і тэхналогіямі прысутнічаюць і новыя – звязаныя з магчымасцямі сучасных ткацкіх станкоў і швейных машын з камп’ютарным абсталяваннем. Актуальнай для сучаснага латвійскага тэкстылю застаецца і стылістыка народнага мастацтва. У тэкстылі, які набыў падкрэслена канцэптуальны характар, акрамя воўны, шоўку, лёну і бавоўны, мастакі сёння эксперыментуюць з паліэстрам, віскозай, палоскамі тканіны, скурай, трыкатажам, тасьмай і г. д. Часам для стварэння тэкстыльных аб’ектаў выкарыстоўваюцца далёка не тэкстыльныя матэрыялы, якія пашыраюць магчымасці пошуку незвычайных мастацкіх вобразаў. Латвійскі міні-тэкстыль не згубіўся ў актуальнай прасторы мастацтва, а малы фармат і камернасць пераcталі быць прыкметай нейкай непаўнавартаснасці твора мастацтва. Відавочна, падкрэслена аўтэнтычны характар міні-тэкстылю ўсё часцей прыцягвае да сябе ўвагу аналітыкаў і дае падставу разважаць пра яго асаблівую папулярнасць.

Блізкія да вышэйпазначаных тэндэнцый мы адзначалі раней і ў развіцці сучаснага беларускага тэкстылю, і ў паэтыка-стылістычным строі агульнавядомай віцебскай школы тэкстылю [2]. Адначасовае існаванне ў двух творчых цэнтрах візуальна падобных мастацкіх з’яў дазваляе зрабіць выснову аб наяўнасці агульных для развіцця сучаснага мастацкага тэкстылю тэндэнцый. Аднак, нягледзячы на іх існаванне, у тым ці іншым выпадку на чале ўсяго стаіць яе вялікасць АСОБА МАСТАКА, якая і вызначае не толькі канцэпцыю і сутнасць мастацкага вобраза, але і характар яго індывідуальнай інтэрпрэтацыі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Егиазарян, А. К. Современный гобелен и пространство / А. К. Егиазарян // Альманах современной науки и образования. – 2009. – № 1 (20). – С. 73–74.

2. Цыбульскі, М. Л. Габелен і сучасны мастацкі тэкстыль: актуальныя праблемы і тэндэнцыі развіцця / М. Л. Цыбульскі // Искусство и культура. – 2014. – № 2. – С. 6–18.

*Паступіў у рэдакцыю 15.03.2016 г.*

Репозиторий ВГУ